Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-04-19

# На тым тыдні...

✓ **11 красавіка** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася **прэзентацыя кнігі Тэрэзы Голуб «Летапіс жыцця і творчасці Аркадзя Куляшова».** Кніга пабудаваная на дакументальным матэрыяле: у выданні змешчаныя і рэдкія фотаздымкі, што з'яўляюцца каштоўнымі ілюстрацыямі да біяграфіі пісьменніка.

Выданне пабачыла свет напрыканцы сакавіка, навуковы рэдактар выдання член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар Міхась Мушынскі. Рэцэнзенты – доктар філалагічных навук Міхась Тычына і кандыдат філалагічных навук Пятро Васючэнка.

✓ **11 красавіка** ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі «Палац мастацтва» адбылося **адкрыццё выстаўкі «Агульнапольскае Біенале студэнцкай графікі. Познань 2011».** Мерапрыемства арганізаванае пры супрацоўніцтве з Мастацкім Універсітэтам у Познані і Польскім Інстытутам у Мінску. У вернісажы ўзялі ўдзел куратары фестывалю прафесар Міраслаў Паўлоўскі і прафесар Стэфан Фіцнер, а таксама прадстаўнікі познаньскага ўніверсітэта. На выстаўцы прадстаўленыя працы студэнтаў амаль што з усіх вышэйшых мастацкіх установаў (Акадэмія мастацтваў у Варшаве, Вроцлаве, Кракаве, Катавіцах, Гданьску, Лодзі, а таксама Мастацкі Універсітэт у Познані, Сілезскі ўніверсітэт у Цешыне, Універсітэт М. Складоўскай-Кюры ў Любліне і многія іншыя). Усяго на выстаўцы прадстаўлена 96 працаў 67-і аўтараў.

*Выстаўка працуе да 26 красавіка.*

✓ **12 красавіка** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбыўся **чарговы этап акцыі «Чытаем Купалу разам».** На гэты раз вершы класіка чыталі вучні школаў, што носяць яго імя: Сенніцкая СШ, Бяларуцкая СШ, СШ № 19 г. Мінска.

✓ **13 красавіка** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылося **адкрыццё выстаўкі «З кутка жаданняў»** (жыццё і творчасць Янкі Купалы ў кніжнай графіцы беларускіх мастакоў). На выстаўцы дэманструюцца мастацкія творы, што ўвайшлі ў залаты фонд беларускай кніжнай графікі XX ст., а таксама кнігі розных гадоў, для якіх ствараліся гэтыя выбітныя ілюстрацыі: кнігі для дарослых і дзяцей, унікальныя мініяцюрныя выданні са збору музея.

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні